# 8-га САКАВІКА—ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН. СА СВЯТАМ!

Женщина! Мудрёней нет загадок,
И века морщинят думой лбы,
Тяжким грузом, или же наградой
Ты мужчине поперёк судьбы!

Женщина! Утеха и потеха,
От пещер великие права,
Лишь тебе твердят от века к веку
Брачные и бранные слова.

А тебе—не нужен трон царицы.
Лишь бы только поняли любя,
Надо не молиться, не браниться,
Надо быть достойными тебя!


# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 5 (848) | Пятніца, 5 сакавіка 1993 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 1 руб.


## І ЎСЁ Ж БУДЗЕМ АПТЫМІСТАМІ...

Першае вясновае свята — 8 Сакавіка звычайна асацыіруецца ва ўсіх з абуджэннем прыроды ад зімовага сну: звонкімі капяжамі, яркімі сонечнымі промнямі, нейкай асаблівай чысцінёй неба. І гэтае прыроднае абнаўленне прыносіць у душы людзей своеасаблівае ачышчэнне, светлыя пачуцці, чаканне лепшых перамен. Але штосьці адбываецца цяпер у прыродзе, у яе размеранай змене адной пары года іншай надышоў збой. Вось і сёлета: зіма была мала падобнай на зіму, таму надыход вясны па-сапраўднаму душой не адчуваецца.

Не стварае святочны настрой і тое эканамічнае, сацыяльнае становішча, у якім сустракаем мы 8 Сакавіка — Дзень жанчын. Растуць цэны, інфляцыя, беспрацоўе, і сярод тых, хто страчвае работу, — пераважная большасць прадстаўніц жаночага полу. Падумаецца міжволі: а ці да свята сёння ім, змучаным чэргамі ў магазінах, талонамі на прадукты, шалёнымі цэнамі, калі з сямейнага бюджэту ёй праблематычна выкраіць грошы на новую прыгожую сукенку, прычоску, хоць нейкую касметыку? А хапае яшчэ праблем і з выхаваннем дзяцей — з-за фінансавых цяжкасцей зачыняюцца дзіцячыя яслі і садкі, апрануць і паўнацэнна накарміць сына ці дачку школьнага ўзросту таксама нялёгка. Словам, кола замыкаецца, і разарваць яго сама жанчына не ў стане. Але яна не скардзіцца, цярпліва «вязе свой воз», ды яшчэ знаходзіць сілы на пяшчоту і ласку для дзяцей, родных і блізкіх. Яна застаецца захавальніцай сямейнага ачагу, бо ён пры любых цяжкасцях з'яўляецца для яе той адзінай крыніцай, з якой яна чэрпае новыя сілы і энергію.

Дык ці да свята сёння жанчынам? На гэта пытанне, думаецца, адказ павінен быць адназначным: свята ўсё ж неабходна! Іх, святаў, у нас цяпер і так мала засталося. Няхай хаця б раз у год яна адчуе сябе па-сапраўднаму жанчынай, слабай і безабароннай, а не такой як у будзённасці, калі яе клопатаў хапіла б адразу на некалькі мужчын. Няхай у гэты дзень абмінуць яе мітусня, трывогі, а прагучаць у яе адрас толькі самыя цёплыя, ласкавыя словы ад блізкіх, родных, дзяцей, таварышаў па рабоце. Няхай пах падораных кветак, падарункі ўскружаць кожнай жанчыне галаву, і яна ўсміхнецца ў адказ, твар яе засвеціцца дабрынёй і прыгажосцю. І ў гэты дзень жанчына ў каторы раз даруе блізкім людзям за іх няўважлівасць, неразуменне, што тыя могуць праявіць у будзённыя дні. Бо нездарма ж яшчэ Жан-Жак Русо сказаў «Царство женщины — это царство нежности, тонкости и терпимости».

Як бы ні складваліся жыццёвыя абставіны, а з верай у змены да лепшага, з аптымізмам усё ж лягчэй пераадольваць цяжкасці. Таму, дарагія нашы жанчыны, дзяўчаты, заставайцеся аптымісткамі. Будзем спадзявацца: лепшыя часы для вас яшчэ надыдуць.



Студэнцкае жыццё ў першакурсніцы эканамічнага факультэта Кацярыны Багданавай яшчэ толькі пачалося, і наперадзе дзяўчыну чакае шмат цікавага і нязведанага. Але можна з упэўненасцю сказаць: старт ёй у вучобе і грамадскім жыцці зроблены ўдалы—першая залікова-экзаменацыйная сесія здадзена з поспехам, з яе ўдзелам, як члена прафкома студэнтаў ГДУ, вырашаюцца многія пытанні жыцця моладзі.

Фота У. Чысціка.

## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Адбылося чарговае пасяджэнне вучонага савета універсітэта. Першым выступіў рэктар, член-карэспандэнт АН Беларусі Л. А. Шамяткоў. Ён расказаў аб рабоце нарады-семінара рэктараў і прарэктараў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі.

З інфармацыяй аб арганізацыі вучэбнага працэсу на геолага-геаграфічным факультэце выступіў намеснік яго дэкана Ю. П. Іваноў.

Вучоны савет зацвердзіў тэмы кандыдацкіх дысертацый, выбраў на вакантныя пасады прафесарска - выкладчыцкі састаў, на конкурснай аснове прыняў рэкамендацыі аб прысваенні вучоных званняў. Быў зацверджаны таксама аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенню 25—гадовага юбілею універсітэта.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць старшага выкладчыка кафедры алгебры і геаметрыі БУЗЛАНАВА Аляксандра Васільевіча (навуковы кіраўнік — прафесар, член — карэспандэнт АНБ Л. А. Шамяткоў) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

• • •

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры оптыкі АХРАМЕНКА Ірыну Мікалаеўну (навуковыя кіраўнікі—прафесар А. М. Сердзюкоў, дацэнт І. В. Семчанка) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

## ВЫХАВАННЕ — СПРАВА ДЗЯРЖАЎНАЯ

Адбылося чарговае пасяджэнне савета пярвічнай арганізацыі ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл універсітэта. На парадку дня былі традыцыйныя «дзяжурныя» пытанні яе дзейнасці: аб рабоце камісіі па патрыятычнаму і інтэрнацыянальнаму выхаванню моладзі на баявых і працоўных традыцыях старэйшага пакалення; аб правядзенні агульнага сходу арганізацыі па рэалізацыі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ветэранах»; аб падрыхтоўцы да свята жанчын — 8 Сакавіка.

Асабліва ажыўлены абмен думкамі разгарнуўся па першаму пытанню парадку дня, паведамленне па якому зрабіў прафесар А. С. Калугін. Агульная думка: ва універсітэце ніякай арганізацыйнай работы з боку кіруючых органаў навучальнай установы па інтэрнацыянальна-патрыятычнаму выхаванню не праводзіцца. Адсутнічаюць нават планы правядзення такой работы, хаця 1993 год, можна сказаць, асабліва спрыяльны для патрыятычнага выхавання: 75-я гадавіна Узброеных Сіл краіны, 50-я гадавіна разгрому фашысцкіх войск пад Сталінградам і на Курскай дузе — пачатак карэннага пералому ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны, 50-годдзе вызвалення Гомеля і рад іншых не «круглых» юбілейных дат.

Ва універсітэце засталіся пакуль у законе толькі чатыры грамадскія арганізацыі, якія могуць і павінны весці такую работу. Гэта прафсаюзы, Саюз студэнцкай моладзі, арганізацыя ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл і жаночы савет. Аднак без зацікаўленай падтрымкі з боку рэктарата, дэканатаў і кафедр гэтыя арганізацыі, асабліва дзве апошнія, пры ўсім іх жаданні могуць устанавіць кантакты са студэнцкай моладзю толькі праз ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл, якія працягваюць яшчэ працаваць са студэнтамі ў якасці выкладчыкаў. І толькі ў працэсе навучання і ў неаўдыторны час (на перапынках, у час індывідуальных кансультацый і г. д.).

Улічваючы гэтыя абставіны, савет абавязаў усіх членаў сваёй арганізацыі, якія маюць пастаянны кантакт са студэнцкай моладдзю, умацаваць індывідуальна-групавую работу па яе інтэрнацыянальна - патрыятычнаму выхаванню, а таксама прыняў рашэнне працягваць пошук шляхоў па актывізацыі гэтай работы ў агульнауніверсітэцкім маштабе.

Па двух іншых пытаннях парадку дня былі прыняты адпаведныя рашэнні. У прыватнасці, быў устаноўлены тэрмін правядзення агульнага сходу членаў арганізацыі — 5 сакавіка бягучага года. На ім намечана шырока абмеркаваць пытанне аб узаемадзеянні савета ветэранаў з дзяржаўнымі і іншымі грамадскімі арганізацыямі па сацыяльнай абароне ветэранаў у сувязі з уводам у дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ветэранах».

**Г. ЕЎДАКІМЕНКА,**
**старшыня савета ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл ГДУ.**




**Набліжаецца цудоўнае свята — Дзень жанчын. Ад усёй душы віншуем дзяўчат і жанчын са святам вясны. Напярэдадні знамянальнага дня — наш расказ аб адной з папулярных рок-спявачак, чыя абаяльнасць і вакальныя даныя зрабілі яе зоркай сусветнага року.**

# Святло прыцягальнай зоркі

Нягледзячы на той факт, што апошняя работа Літы Форд у студыі гуказапісу адбылася дастаткова даўно і сёння Літа цалкам і поўнасцю прысвяціла сябе сваёй сям'і і па яе словах: «Ні аб якой музычнай рабоце ў бліжэйшыя гады не можа ісці і размовы. У мяне з'явілася новая цяга. Імя ёй — Простыя Хатнія Клопаты. Я іх вельмі паважаю. Я ніколі не думала, што ўсё гэта настолькі складана і стамляльна. Хаця я атрымліваю «кайф» ад усяго гэтага». І, нягледзячы на гэта, Літа Форд і па сённяшні дзень застаецца адной з самых паважаных і шанаваных «рок-ледзі» свету. Дык у чым жа справа?

Нарадзілася Літа Форд 19 верасня 1959 года. Сваю музычную кар'еру пачынала ў групе «Рануэйс» у сярэдзіне 70-х гадоў. Праз некаторы час гэта група распалася, але Літа вырашыла працягваць работу ў року самастойна. Эксперыменты і пошук свайго твару цягнуліся крыху больш чатырох гадоў. За гэты час аб ёй практычна нічога не было чутна. У 1983 годзе на прылаўках музычных магазінаў з'яўляецца дэбютны альбом «Аут Оф Зэ Блуд» («У баку ад крыві»). Дапамогу ў запісу гэтага альбома прынялі Нейл Мерыуатэр — бас, Дасці Уатсан — ударныя і розныя сесійныя музыканты, якія запрашаліся для запісу асобных кампазіцый. І хаця гэта пласцінка раскуплялася, мякка кажучы, не вельмі добра, тым не менш, першы крок да будучай папулярнасці быў зроблены: музычныя фаны звярнулі на Літу сваю ўвагу.

Праз год Літа падправіла свае справы, змяніўшы некаторыя тэхнічныя хады ў музыцы і ўзмацніўшы «саунд», выпускае другі сольны дыск пад назвай «Дэнсінг Он Зэ Эдж» («Танцуючы на краю»). Гэта пласцінка мела дастаткова шырокі поспех: попыт на яе быў больш высокі і ў Англіі, і ў Амерыцы, дзе гэты дыск увайшоў у многія хіты. Звязана гэта было з тым, што для запісу гэтай пласцінкі Літа Форд запрасіла ўсіх новых музыкантаў: Х'ю МакДональд — бас і Рэндзі Касціло — ударныя — былі дастаткова вядомыя ў музычных колах і дастаткова прафесіянальныя. Гэта хутка адбілася на выніках запісанага матэрыялу. Акрамя гэтай «двойкі», у запісу альбома ў агульнай складанасці прынялі ўдзел каля 20 музыкантаў. Дзякуючы гэтаму класічнаму дыску, Літа Форд увайшла ў гісторыю року і, можна нават сказаць, у эліту стылю хэві-метал. Гэты альбом і па сённяшні дзень з'яўляецца самым лепшым дыскам з усяго, што было запісана ў рок-музыцы жанчынамі.

Яшчэ адным плюсам гэтага альбома было і тое, што, нягледзячы на запіс гэтага альбома, Літа на доўгі перыяд практычна адышла ад рок-спраў, і тым не менш слава і аўтарытэт яе засталіся на ранейшым дастаткова высокім узроўні. Толькі ў канцы 1987 года Літа зноў вяртаецца ў студыю для работы над новым альбомам, які выйшаў у свет у 1988 годзе і называўся проста і ясна: «Літа». Фінансаваць гэты дыск узяўся Майк Чэпмэн. У рабоце над гэтым альбомам Ліце дапамаглі Нікі Сікс з «Мотлі Кру», Лемі Кілмайстэр з «Моторхед», а Озі Осбарн нават праспяваў разам з Літай Форд дуэтам песню «Іф Ай Клоус Май Айс Форэвэ» («Калі я закрыю свае вочы назаўсёды») — класічны хіт з гэтага альбома. Крыху пазней па матывах гэтай песні быў зняты цудоўны відэакліп.

І нягледзячы на тое, што Літа ў чарговы раз закінула ўсё, што звязана з рокам, яе пласцінкі па-ранейшаму папулярныя, а яе будучае вяртанне на сцэну абяцае быць яшчэ больш грандыёзным, чым у былыя часы. Што ж, пажывем — пабачым...

**Вядучы рубрыкі — П. БЕСЯЦКІ, асістэнт кафедры рускай літаратуры.**

*Вясёлы перапынак*

●

## АБ ЖАНЧЫНАХ З ГУМАРАМ

● Чым разумнейшая жонка, тым больш упэўненым адчуваеш сябе, калі яна адсутнічае.

● Ад жанчыны ёсць толькі адно выратаванне — іншая жанчына.

● Калі мужчына прыйшоў да жанчыны з бутэлькай гарэлкі, значыць, ён прыйшоў з сур'ёзнымі намерамі.

● Жанчыны не даруюць мужчынам памылак — яны тут жа выходзяць за іх замуж.

● Калі джэнтльмен цалуе жанчыну вельмі доўга, гэта значыць, што яна вельмі балбатлівая.

● Не страшна, калі жанчына дрэнна рыхтуе ежу, страшна, калі яна прымушае ўсё з'есці.

● Каханне — гэта агонь, а шлюб — вогнетушыцель.

● Жанчына пудрыць сабе твар, каб пудрыць мужчынам мазгі.

● Адна дама прыйшла да ўрача са скаргамі на галаўны боль. Урач парэкамендаваў ёй выйсці замуж. Праз год ён яе выпадкова сустрэў.

— Ну як, выйшлі замуж?

— Так, дзякуй!

— А галава баліць?

— Не, цяпер баліць у майго мужа!

● Адзін джэнтльмен напісаў ліст з камандзіроўкі сваёй жонцы: «Дарагая, лепш за цябе няма ніводнай жанчыны! Учора я зноў у гэтым упэўніўся!».

## СТАНУЦЬ ПРАВАДНІЦАМІ

З просьбай дапамагчы забяспечыць летам пасажырскія перевозкі сіламі студэнцкіх атрадаў праваднікоў да рэктараў нашага універсітэта і БІІЧТу звярнуўся начальнік Гомельскай дырэкцыі па абслугоўванню пасажыраў В. К. Барэйша.

Для гэтага за кошт дырэкцыі прапануецца арганізаваць спецыяльныя курсы для студэнтаў. Падрыхтоўку атрымаюць 20 студэнцкіх атрадаў праваднікоў.



СВЯТЛАНА. Фотаэцюд У. Чысціка.

## І КВЕТАК ПАХ ЧАРОЎНЫ...

Цяжка ўявіць свята 8 Сакавіка без букетаў кветак. Іх пах і прыгажосць надаюць гэтаму дню своеасаблівую ўрачыстую атмасферу. Яны быццам вітаюць жанчын, настройваюць іх душы на светлы лад. Але, на жаль, кветкі недаўгавечныя, і каб яны як мага больш часу стваралі святочны настрой, іх «жыццё» з дапамогай маленькіх сакрэтаў можна падоўжыць.

Галінкі мімозы доўга прастаяць у вадзе, калі пакласці іх у цёплую кіпячоную ваду (25—30°) і дабавіць некалькі кропель воцатнай эсенцыі. Затым трэба абнавіць зрэз, раздрабіць канец сцябла малатком і паставіць галінкі ў ваду. Пасля такой апрацоўкі мімоза захоўвае дэкаратыўнасць на працягу многіх дзён.

Догляд за гвяздзікамі просты: кожныя чатыры дні мяняйце ваду і падразайце сцяблінкі.

Цюльпаны — стойкія. Калі яны крышачку завялі, іх ставяць на яркае святло, і яны зноў выпрамляюцца.

Калі кветкі крыху падвялі (але не ад таго, што адцвілі, а проста «стаміліся»), зноў падрэжце галінкі пад вадой, апырсніце пялёсткі і лісце, загарніце галоўкі ў добра ўвільготненую паперу, пастаўце глыбока ў крыху цёплую ваду. Можна таксама, падрэзаўшы ў вадзе галінкі, пакласці кветкі на ноч у ванну, напоўненую вадой. Раніцай букет ажыве.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**З 15 сакавіка па 10 мая аб'яўляецца падпіска на газеты і часопісы на 2-е паўгоддзе 1993 года.**

**По пытаннях падпіскі звяртацца да грамадскіх распаўсюджвальнікаў на кафедрах і аўд. 2-30 галоўнага корпуса.**

**Тэл. для даведак: 56-22-62, 56-73-82.**

*Тэст*

## ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ ДЗЯЎЧАТ

**I. Калі вы адпраўляецеся на спаткане, вы апранаеце:**
а) сукенку, якая вам падабаецца, — 2;
б) сукенку, якая яму падабаецца, — 3;
в) самую новую сваю сукенку — 1.

**2. Калі вы праводзіце вечар дома з бацькамі:**

а) гэта для вас пакуты — 2;
б) вам цікава і прыемна—3;
в) вы лічыце час страчаным — 1.

**3. Калі вам сябар дорыць кнігу:**

а) кажаце яму, што менавіта аб такой і марылі — 3;
б) гатовыя абмяняць яе на іншую — 2;
в) міжволі ўсклікваеце: «У мяне ўжо ёсць такая!» — I.

**4. Ён абяцаў пазваніць па тэлефоне, але чамусьці маўчыць.**

а) вы плачаце — 2;
б) праводзіце цэлы дзень каля тэлефона — 3;
в) як ні ў чым не было ідзеце гуляць з іншым — 1.

**5. Калі вы не падабаецеся яго маці:**

а) стараецеся лічыцца з яе патрабаваннямі — 2;
б) пытаецеся аб прычынах яе антыпатыі да вас — 1;
в) дорыце ёй кветкі і просіце паказаць фатаграфію сына, калі ён быў маленькім, — 3.

**6. Сябар запрасіў вас пайсці куды-небудзь, а вам вядома, што ён абмежаваны ў сродках:**

а) прапануеце падзяліць расходы на дваіх — 2;
б) прапануеце проста гуляць — 3;
в) заводзіце размову аб новых фільмах — I.

**7. Пасля канфлікту, у якім вы адчуваеце сябе вінаватай:**

а) чакаеце, каб ён першым папрасіў вас аб сустрэчы;
б) пішаце яму запіску і просіце прабачэння — 3;
в) расказваеце сяброўкам аб тым, што здарылася, не гаворачы аб сваёй віне — I.

**8. Ваш сябар любіць спорт:**

а) вы ходзіце разам з ім глядзець спаборніцтвы — 2;
б) адабраеце яго хобі — 3;
в) аддаеце перавагу сядзенню дома — I.

**9. Калі вы сустракаеце сваю былую сімпатыю:**

а) адмаўляецеся ад спаткання з ім — 2;
б) гаворыце яму аб тым, што кахаеце іншага — 3;
в) успамінаеце аб мінулым і згаджаецеся на спатканне — I.

**10. У выпадку доўгай разлукі:**

а) праводзіце час з сяброўкамі, каб не адчуваць сябе адзінокай — 2;
б) праводзіце час у адзіноцтве і пастаянна пішаце лісты свайму сябру — 3;
в) успамінаеце аб сваёй былой сімпатыі — I.

**28 і больш ачкоў — вы па-сапраўднаму закаханыя.**

**15—20 ачкоў—вы думаеце, што закаханыя, хаця на самой справе гэтага нельга сказаць з поўнай упэўненасцю.**

**Менш 15 ачкоў — абсалютна дакладна можна сказаць, што вы яго не кахаеце.**

**Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.**

**«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельскага дзяржаўнаг універсітэта імя Ф. Скарыны.**

**Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.**

**Рэгістрацыйны № 221**

**Спонсары газеты — Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП «Сучасныя тэхналогіі», прафком студэнтаў.**

**Гомельская фабрыка «Палесдрук» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь г. Гомель, Савецкая, 1.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Аб'ём 1 друк. арк. Тыраж 1.500 экз. Заказ 141.**

**Падпісана да друку ў 16.00.**